ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO. 30 (3534) ● ЧАЦВЕР, 10 ЖНІЎНЯ, 2017

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Кніга зменьвае лёсы
Унікальнае выданне “Сусветная спадчына Францыска Скарыны” было прадстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі Стар. 2

Максім Танк. Паштоўка, адрасаваная на Кубу
Стар. 4

Далёкі родны брат
Пра тое, што ў Якуба Коласа за акіянам жыве родны брат Міхась Міцкевіч, раней не пісалі ні ў школьных падручніках, ні ў савецкіх СМІ Стар. 4

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Блізка як ніколі раней

Нават на італьянскай Сардзініі, адным з астравоў Міжземнага мора, сёлета можна з галавой акунуцца ў плынь беларускай культуры

Кацярына Мядзведская

Сярод лепшых навучэнцаў культурна-адукацыйнай праграмы “Менеджар па турызме” Вучэбнага цэнтра “Сардзінія Глобал”, які працуе ў Мінску, сёлета была і Дар’я Колесава з Гомеля. Выпускніца не стрымлівала эмоцый, слёз радасці, калі ўручалі ёй сертыфікат на гадавую стажыроўку ў адным з гатэляў вострава Сардзінія. Пасля прызналася: у тым рэгіёне Італіі бывала — па праграме аздараўлення дзяцей з пацярпелых пасля Чарнобыльскай аварыі тэрыторый Беларусі. Помніцца Дар’і той райскі куточак: празрыстае мора, чысцюткія пясочныя пляжы, ярка-зялёнае лісце фікусаў ды пальмаў... Некалькі разоў дзяўчына жыла ў сардзінскіх сем’ях. У Беларусі ж вывучала італьянскую мову. Калі ўбачыла ў інтэрнэце аб’яву пра набор слухачоў для навучання па вышэйзгаданай праграме, то адразу ж падала дакументы.

Ансамбль танца “Чабарок” на фальклорным фестывалі ў сардзінскім Іглесіасе

Падрыхтоўка менеджараў па турызме — адна з сумесных праграм паміж Беларуссю і Сардзініяй. Увогуле двухбаковыя стасункі даўнія, ім болей за 25 год. Пачыналіся з Чарнобыльскіх праектаў, дзякуючы ім тысячы беларускіх дзяцей аздаравіліся ў сардзінскіх сем’ях. З часам аформіліся навуковыя, эканамічныя, турысцкія, адукацыйныя стасункі, з’явіліся партнёрскія сувязі паміж універсітэтамі.

Летась, напрыклад, Сардзінія была прадстаўлена на Сусветным тыдні італьянскай кухні, што праходзіў у Мінску. Сёлета ў сакавіку для ўмацавання кантактаў між універсітэтамі Кальяры і навучальнымі ўстановамі Беларусі былі праведзены Дні адукацыі ды навукі Сардзініі ў Мінску. Пад час Міжнароднай выставы “Адпачынак-2017” Сардзінія прадставіла свой стэнд, прайшла й прэзентацыя турпатэнцыялу вострава пад назвай “Сардзінія — пярліна Міжземнамор’я і скарб Італіі”. Адна з навін, пра якую паведаміў нам Гаваровы консул Беларусі ў Кальяры Джузэппе Карбоні, — Універсітэт г. Кальяры (Сардзінія-Італія) і Беларускі дзяржаўны педуніверсітэт імя Максіма Танка дамовіліся аб супрацоўніцтве ў сферы інклюзіўнай адукацыі.

А Годам беларускай культуры на Сардзініі абвешчаны 2017-ы. У маі ў гарадах Кальяры і Сасары перад мясцовай публікай выступіў фольк-гурт “Вурай”. “Музыканты калектыву, саліст Сяржук Доўгушаў, гітарыст Іван Арцімовіч, кантрабасіст Эрык Арлоў, скрыпачка Насця Папова, барабаншчык Даніил Залескі збіраюць народныя беларускія песні ў экспедыцыях па краіне. Затым надаюць ім новае гучанне ў студыі. Вынікам іх працы з’яўляецца добра збалансаваная сумесь фольку, рока, джаза і псіхадэлічных эфектаў. Сумяшчэнне традыцыйных народных беларускіх песень і сучасных аранжыровак выклікала вялікі поспех у італьянскай публікі, асабліва ж у моладзевай аўдыторыі”, — піша Джузэппе Карбоні. → Стар. 4

ЮБІЛЕЙ

90 год — разам з чытачамі

Іна Ганчаровіч

Самая масавая і самая ўплывовая газета краіны — “СБ. Беларусь сегодня” — святкуе юбілей

На працягу амаль цэлага стагоддзя газета адлюстроўвае гісторыю зямлі і лёсы людзей, якія жывуць на ёй. За дзесяцігоддзі выданне мяняла назву, фармат, тыраж і перыядычнасць, але заўсёды заставалася добрым і цікавым суразмоўцам для чытачоў.

Першы нумар газеты выйшаў 2 жніўня 1927 года пад назвай “Рабочий”. У 1937 годзе выданне перайменавалі ў “Советскую Белоруссию”. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў глыбокім тыле, спецыяльна для акупаваных тэрыторый стала выходзіць ваенная “Савецкая Беларусь” на беларускай мове, якая самалётамі дастаўлялася на лясныя аэрадромы і потым “разляталася” па партызанскіх атрадах, гарадах і вёсках. Адыграўшы сваю гістарычную ролю, адразу пасля вызвалення Беларусі газету зноў сталі зваць “Советская Белоруссия”. Сёння гэта сучасная газета, якая выходзіць у поўнакаляровым фармаце амаль паўмільённым штодзённым тыражом. І яе з задавальненнем чытаюць і пажылыя, і маладыя. І гэта не проста газета, а велізарны медыяхолдынг, які аб’ядноўвае некалькі рэспубліканскіх газет, часопісаў, тэлеканал і радыёстанцыю. І называецца ён “СБ. Беларусь сегодня”.

Але большасць з нас да гэтага часу па-ранейшаму называе яе “савецкай”. Настолькі трывалае месца за гады заняла яна ў нашым жыцці.

МАРШРУТАМІ ЛЕТА

Падарожжа ў Кракаў

У гэтым горадзе ў свой час вучыўся Францыск Скарына

Даўно марыў наведаць Кракаў: адзін з найстаражытных гарадоў Еўропы называюць пярлінаю Польшчы. Мне даводзілася чуць, што ў некаторых краінах людзі на свой дзень нараджэння робяць сабе падарункі — адпраўляюцца вандраваць. Набліжаўся мой юбілей, таму і выбраўся я ў горад мары.

Тое, што меркаваў пабачыць, не супала з праграмай турграпы, у складзе якой быў. Мяне цікавілі мясціны горада, звязаныя з жыццём і творчым шляхам нашых супляменнікаў, ураджэнцаў Беларусі. Безумоўна, многія хочуць наведаць найперш замак Вавель, рэзідэнцыю былых польскіх каралёў. Уразіла мяне архітэктура помніка, пры якім знайшлі вечны спакой як былыя каралі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), так і нашы суайчыннікі Адам Міцкевіч, Тадэвуш Касцюшка — скульптура яго на баявым кані ўзвышаецца ля таўшчэзнай крэпасной сцяны замка. У часы Другой сусветнай вайны фашысты вывезлі папярэднюю скульптуру на пераплаўку, у Германію. А ў пасляваенны час немцы стварылі новы помнік — і ўсталявалі яго на ранейшым месцы.

Пешая вандроўка па вулачках горада — і вось мы на тэрыторыі славутага Ягелонскага ўніверсітэта. Адна са старэйшых у Еўропе навучальных устаноў: заснавана ў 1364-м каралём Польшчы і ВКЛ Казімірам III (Ягелончыкам). Універсітэт, дарэчы, быў названы ў гонар Вялікага князя ВКЛ Ягайлы, які пасля жаніцьбы з польскай каралевай Ядвігай (1386) набыў тытул і караля Польшчы. Там вучыліся многія прадстаўнікі беларускай шляхты: Сапегі, Свірскія, Гальшанскія. А на пачатку XVI стагоддзя на філасофскім факультэце займаўся і атрымаў вучоную ступень бакалаўра філасофіі Францыск Скарына. Дарэчы, такую ж вучоную ступень атрымаў тут пазней, у 1532-м, і кнігавыдавец-асветнік Іван Фёдараў. Цяпер ёсць факты на карысць таго, што нарадзіўся ён на беларускай Вілейшчыне, паходзіў са старажытнага шляхецкага роду Рагозаў. Вучыўся ў Кракаўскім універсітэце і беларускі асветнік Сымон Будны, аўтар “Катэхізіса”, першага твора на беларускай мове.

Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве

Як вядома, з Кракавам звязана і жыццё графа Эмерыка фон Гутэн Чапскага, які нарадзіўся, жыў у вёсцы Станькава — цяпер Дзяржынскі раён пад Мінскам. На пачатку 90-х гадоў XIX стагоддзя граф раздзяліў сваю маёмасць паміж сынамі Ежы і Карлам.

→ Стар. 3

ПАДЗЕЯ

Кніга зменьвае лёсы

Унікальнае выданне "Сусветная спадчына Францыска Скарыны", у якое ўвайшлі ўсе 25 кніг беларускага першадрукара, было прадстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі

Карына Аляксандрава

БЕЛТА

Міністр інфармацыі Лілія Ананіч падчас прэзентацыі

Напярэдадні прэзентацыі кнігі "Сусветная спадчына Францыска Скарыны" яе аўтар-складальнік намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша пісаў на старонцы ў фэйсбуку: "3 жніўня 2017 года — за тры дні да 500-годдзя выхаду першай беларускай кнігі!!! — адбудзецца прэзентацыя выдання "Сусветная спадчына Францыска Скарыны". Кніга выйшла зусім нядаўна — напачатку лета, — але ўжо атрымала Гран-пры Міжнароднага конкурсу краін–удзельніц СНД "Мастацтва кнігі — 2017" і Гран-пры Еўразійскай міжнароднай кніжнай выставы Eurasian Book Fair 2017".

Па словах Міністра інфармацыі Беларусі Лілліі Ананіч, сёлета беларуская кніга ўжо была прадстаўлена ў Літве, Чэхіі, Францыі. Да канца года нацыянальнае кнігавыданне будзе прэзентавана ў Пекіне, а таксама на выставах у Сербіі, Германіі. Казала Лілія Ананіч і пра тое, што друкаваная кніга ў нашай краіне па-ранейшаму запатрабаваная.

Гаворачы аб выданні "Сусветная спадчына Францыска Скарыны", Лілія Ананіч назвала вялікім гонарам тое, што напярэдадні 500-гадовага юбілею беларускага кнігавыдання выйшла такая кніга — адна з лепшых, на яе думку, якая ўжо ўвайшла ў скарбонку нацыянальнага і сусветнага кнігавыдання.

Багата ілюстраванае выданне выйшла ў серыі "Энцыклапедыя рарытэтаў" у выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай. Упершыню ў адной кнізе прадстаўлены ўсе 25 кніг беларускага першадрукара. У сучасным выданні сабрана кніжная спадчына Францыска Скарыны, якая сёння з'яўляецца нацыянальным здабыткам і зберагаецца ў кніжных і музейных зборах многіх краін свету — Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Даніі, Польшчы, Літвы, Вялікабрытаніі, Славеніі, Чэхіі.

Складальнік кнігі — Алесь Суша. Аўтары тэкстаў — Алесь Суша і Галіна Кірэева. Мастак — Алена Сітайла. Дадатковае фінансаванне на выпуск кнігі ажыццявіла Міністэрства інфармацыі Беларусі. "Мы працавалі над гэтым выданнем каля пяці гадоў, — казаў Алесь Суша. — Збіралі фотаздымкі з розных краін свету, рыхтавалі падрабязны аналіз кожнага з выданняў беларускага першадрукара".

На прэзентацыі былі прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса замежных краін, СМІ. Так, Амбасадар Германіі ў Беларусі Петэр Дэтмар адзначыў важную асветніцкую дзейнасць Францыска Скарыны. Яго рэвалюцыйны ўклад у кнігадрукаванне, на думку амбасадара, не толькі ў перакладзе Бібліі, але і ў распаўсюджванні ідэй адукацыі і асветы сярод простых людзей. 500 гадоў таму — 6 жніўня 1517 года — у Празе выйшла першая друкаваная беларуская кніга — Псалтыр, якая лічыцца адной з самых папулярных і распаўсюджаных у хрысціянстве кніг Бібліі. Гэтай кнігай першадрукар Францыск Скарына паклаў пачатак усяму беларускаму кнігавыданню, якое развівалася ў цеснай сувязі з еўрапейскім і ўсходнеславянскім. Унікальная кніга "Сусветная спадчына Францыска Скарыны" прымеркавана да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

"Значнасць выхаду першай друкаванай кнігі для лёсу нашай краіны складана пераацаніць, — упэўнены Алесь Суша. — Некаторыя пастановы з Бібліі ўвайшлі ў заканадаўства дзяржавы, а ўся краіна перажыла вялікі ўздым як у духоўным, так і ў эканамічным плане. Запрашаем усіх разам з намі адсвяткаваць гэту знакавую падзею і яшчэ раз асэнсаваць той грамадны ўнёсак, які зрабіла Біблія для развіцця нашай краіны!"

Падзяліўся Алесь Суша і яшчэ адной навінай: алічбаваныя тры кнігі Францыска Скарыны са збораў Брытанскай бібліятэкі. А 14 верасня пад час Міжнароднага кангрэса "500 гадоў беларускага кнігадрукавання" адбудзецца афіцыйная цырымонія перадачы "сканаў" Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР

Разумеюць і ва В'етнаме

Алесь Карлюкевіч

Пісьменнік Тхуі Тоанг стварае магчымасць і ва В'етнаме чытаць тое, што пісалі Францыск Скарына і Янка Купала

В'етнамскі пісьменнік Тхуі Тоанг нарадзіўся 11 сакавіка 1938 года ў вёсцы Фу Люй правінцыі Тышон Вакнінь. Цяпер вёска — у складзе горада Тышон правінцыі Вакнінь. В'етнамскі перакладчык, паэт, публіцыст, літаратуразнаўца закончыў філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна. Член Саюза пісьменнікаў В'етнама. Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Расіі.

У 12 гадоў будучы пісьменнік патрапіў у ваенную школу, якая рыхтавала папаўненне для В'етнамскай арміі. Для барацьбы, зразумела, з французскімі каланізатарамі. У 1954 годзе в'етнамцы атрымалі славутую перамогу ля Д'ен Б'ена. Назвалі гэтую падзею "в'етнамскім Сталінградам". Пасля перамогі хлопчыка разам са 100 іншымі аднагодкамі адправілі вучыцца ў Савецкі Саюз. Так Тхуі і аказаўся ў Маскоўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя У.І. Леніна. З таго часу і парадніўся з рускай літаратурай, з літаратурамі народаў былога Савецкага Саюза. Перакладаў творы Аляксандра Пушкіна, Міхаіла Лермантава, Фёдара Цютчава, Івана Буніна, Сяргея Ясеніна, Мікалая Рубцова, Уладзіміра Высоцкага і інш. Агулам з'яўляецца аўтарам перакладаў болей як 60 кніг. Пераклаў на в'етнамскую мову многія творы не толькі рускіх, але і іншых народаў Савецкага Саюза пісьменнікаў. Перакладчык "Слова пра паход Ігаравы" на в'етнамскую мову. Перакладчык зборніка "Беларускія народныя казкі" (Ханой, "Ван Хок", 1985; апошняе выданне — 2008 год) на в'етнамскую мову. Пераклаў таксама вершы Янкі Купалы, у тым ліку — і верш "А хто там ідзе?" Тры вершы народнага паэта Беларусі Янкі Купалы былі надрукаваны ў літаратурнай в'етнамскай газеце ў ліпені 1982 года — да 100-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры. Між іншым, разам з уступным словам самога перакладчыка.

Тхуі Тоанг — і аўтар многіх артыкулаў па пытаннях мастацкага перакладу. Для кнігі "Францыск Скарына на мовах народаў свету" (2015, 2-е выд. — 2016) пераклаў урывак з прадмовы Ф. Скарыны да кнігі "Юдзіф" — на в'етнамскую мову. Узнагароджаны ордэнам Дружбы (Расійская Федэрацыя, 2010), медалямі А. Пушкіна (2010), С. Ясеніна (2015) (Расійская Федэрацыя).

Цяпер Тхуі Тоанг лістуецца з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі. Шукае тэксты для новых зваротаў да беларускай літаратуры як перакладчык. Цікавіцца дзіцячай літаратурай Беларусі. "Памятаю, з якой ахвотай чытач расхопліваў кнігу беларускіх народных казак на в'етнамскай мове, — успамінае Тхуі Тоанг, — дык, мяркую, што не меней цікавай падасца і кніга, напрыклад, аўтарскіх казак беларускіх пісьменнікаў. На маім рабочым стале цяпер ляжаць падрадкоўнікі даўнейшых вершаў Вольгі Іпатавай і Уладзіміра Карызны пра В'етнам, в'етнамскіх дзяцей. Збіраюся перакласці гэтыя творы на в'етнамскую мову".

Пісьменнік Тхуі Тоанг

А ў Беларусі в'етнамскую літаратуру на беларускай мове ведаюць найперш па перакладах паэзіі. У свой час Язэп Семяжон падрыхтаваў анталогію паэтаў В'етнама "Апалены лотас", а Янка Сіпакоў пераклаў "Турэмны дзённік" Хо Шы Міна.

Літаратура В'етнама з'яўляецца шматнацыянальнай. Тут размаўляюць і пішуць на в'етнамскай, нгуонскай, мыонгскай, кхмерскай, мангскай, фонгскай, кхангскай, пака і іншых мовах. Добра было б развіць стасункі і класічныя радкі Скарыны пераказаць народам, якія карыстаюцца менавіта гэтымі мовамі, іх родным мастацкім словам.

ВЕСТКІ

Вярнуўся ў бронзе

Помнік Францыску Скарыну будзе ўсталяваны ў Кішынёве

Хутка ў малдаўскай сталіцы стане на адну беларускую мясціну болей. Насупраць Амбасады Беларусі ў Кішынёве, у скверы на скрыжаванні вуліц Аляксея Маціевічы і Мітрапаліта Гаўрыіла Бэнулеску-Бадоні, з'явіцца помнік Францыску Скарыну. Ён будзе ўсталяваны сёлета ў лістападзе. Працуе над помнікам скульптар Генадзь Лойка. Менавіта яго праца стала лепшай на конкурсе эскізных праектаў, што праводзіўся Міністэрствам культуры Беларусі. У журы ўваходзілі прадстаўнікі Мінкультуры, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гімназіі-каледжа мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка, Беларускага саюза мастакоў.

Дарэчы, Генадзь Лойка ужо вырабляе мадэль у натуральную велічыню. Вядома: адліюць помнік на скульптурным камбінаце Беларускага саюза мастакоў. Кампазіцыя вышынёй амаль у адзін метр будзе ўсталявана на пастаменце, які зробяць у Кішынёве. Агульная вышыня помніка складзе крыху больш за 2,5 метры.

Рашэнне аб усталяванні помніка беларускаму першадрукару Францыску Скарыну ў Кішынёве было прынята ўрадам Малдовы і мэрыяй муніцыпія Кішынёў. Ініцыятарам жа з'яўлення скульптуры стала Міністэрства культуры Беларусі з мэтай ушанавання памяці славутага першадрукара, а таксама з нагоды 500-годдзя з выдання першай кнігі на беларускай мове.

Памяць адгукаецца ў сэрцы

У Польшчы, на месцы былога лагера смерці "Трэблінка", прайшла акцыя, прысвечаная 74-й гадавіне паўстання вязняў

Памяць загінуўшых ушанавалі ўскладаннем кветак да помніка-маўзалея на сімвалічных камянёвых могілках. У Музеі барацьбы і пакутніцтва ў Трэблінцы адкрылася выстава "Калі я слухаю апавяданні з Трэблінкі штосьці пачынае ціснуць маё сэрца".

У перыяд з ліпеня 1942 па кастрычнік 1943 гадоў у лагеры Трэблінка фашыстамі было знішчана каля 900 тысяч чалавек. У асноўным — гэта былі яўрэі з Польшчы і краін Еўропы, мноства — з беларускіх гарадоў і мястэчак.

Галоўная мэта акцыі — захаванне памяці аб трагічных старонках жыцця яўрэйскага народа і ахвярах фашызму ў часы Другой сусветнай вайны, выхаванне моладзі праз вывучэнне гісторыі.

Беларускія дыпламаты ўсклалі кветкі да помніка-маўзалея, наведалі могілкі з сімвалічных камянёў з назвамі беларускіх гарадоў, пакінулі запіс у кнізе наведвальнікаў музея.

Штогод да помніка-маўзалея і сімвалічных могілак з камянёў на месцы былога лагера смерці "Трэблінка" прыязджае каля 60 тысяч чалавек з розных краін свету.

МАРШРУТАМІ ЛЕТА

Падарожжа ў Кракаў

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

А паколькі па Еўропе хадзіў "прывід рэвалюцый", то ў 1894-м свой каштоўнейшы музейны скарб у шасці таварных вагонах граф перавёз са Станькава ў Кракаў, які быў на той час па-за межамі Расійскай імперыі. Скарбы, размеркаваныя ў набытым Чапскім двухпавярховым будынку, — гэта нумізматыка, старажытныя парцаляна, зброя, каштоўная бібліятэка (звыш 20 тысяч унікальных выданняў!), геалагічная і мінералагічная калекцыя (лічылася найвялікай у Еўропе!). Паводле завяшчання Эмерыка Чапскага, усё гэтае багацце склала аснову дзейнага сёння ўнікальнага музея — ён недалёка ад цэнтра горада, на вуліцы Ю. Пілсудскага, 12. Я адхіліўся ад маршрута тургрупы, наведаў музей Эмерыка Чапскага і перадаў туды на захаванне шэраг беларускіх газет. Сярод іх "Голас Радзімы", "Советская Белоруссия" з артыкуламі прафесара Адама Мальдзіса пра Эмерыка фон Гутэн Чапскага і вёску Станькава. І газеты, і ліст дырэктару музея праз мяне перадаў сам Адам Іосіфавіч.

Сын Эмерыка Чапскага, Карл, доўгі час быў галавою Мінска і шмат зрабіў для горада добрых спраў. У музеі мяне гасцінна сустрэла Іаланта Рынкевіч. Падзякавала за газеты, падарыла на ўспамін маляўнічы буклет, які перададзены ў музей Чапскага, што месціцца ў будынку школы ў Станькаве. Што да самога графа Эмерыка, то ў 1896-м ён памёр — кажуць, ад інфекцыі, што занёс дантыст, лечачы ягоны балючы зуб... Пахавалі графа на старажытных кракаўскіх Ракавіцкіх могілках. І вось дзякуючы Юрыю Гардзееву, нашаму земляку — ён выкладае беларускую мову і літаратуру ў Ягелонскім універсітэце, а таксама Алесю Ланеўскаму, супрацоўніку Польскай Акадэміі навук, мне ўдалося знайсці дагледжаныя магілы Эмерыка Чапскага і беларускага паэта, ураджэнца Міншчыны Алеся Гаруна. Пры ўваходзе на могілкі ёсць і магіла беларускага гісторыка, археолага, этнографа, выдаўца Адама Кіркора. І гэта далёка не поўны пералік нашых суайчыннікаў, якія жылі, працавалі ў Кракаве.

Тут выдаў свой першы паэтычны зборнік "Дудка беларуская " паэт Францішак Багушэвіч. З горадам звязана дзейнасць беларускага пісьменніка, краязнаўцы, гісторыка Аляксандра Ельскага, беларускага паэта і фалькларыста Адама Гурыновіча.

ЛЯВОН ЦЕЛЕШ

Прыцягальны для турыстаў старажытны цэнтр Кракава

Кракаў на гравюры 1493 года Гартмана Шэдэля

Наведаў я і езуіцкі Касцёл св. Барбары: там на працягу амаль паўтара стагоддзя знаходзіцца арыгінал праваслаўнага абраза Маці Божай Юравіцкай Міласцівай. Святыня цяпер — у нішы, за жалезнымі дзвярыма-кратамі. Мне ўдалося зрабіць яе здымак. Пра лёс беларускай святыні ў часопісе "Наша вера" пісаў Адам Мальдзіс. А ў "Голасе Радзімы" пад загалоўкам "Са святыняй на руках" (2013 г.) пра абраз пісаў і я. Нагадаю, пра што ішла размова. Упершыню абраз згадваецца ў хроніках з 1630 года. Напрыканцы XVII стагоддзя ксёндз львоўскага калегіума Марцін Тыраўскі збудаваў у вёсцы Юравічы (сённяшні Калінкавіцкі раён) капліцу, дзе змясціў абраз, які ўжо тады выяўляў цуды — дапамагаў вылечвацца хворым, даваў суцяшэнне многім у смутныя часы. Так і стаў ён вядомым у Кіеўскім, Чарнігаўскім, Мінскім ваяводствах. Тысячы паломнікаў ішлі да абраза. У 60-х гадах XIX стагоддзя ксёндз-канонік Гуга Гадзецкі, каб зберагчы святыню, вырашыў з яе зрабіць копію, якую выканала мастачка з Піншчыны Алена Скірмунт. Для лепшага захавання — бо на Беларусі ж было неспакойна — сам арыгінал абраза быў вывезены ў Кракаў, перададзены ў дэпазіт у мясцовы касцёл. Прычым з умовай, што з надыходам спрыяльных часоў на Беларусі айцы-езуіты вернуць яго ў Юравічы. На жаль, тое пакуль не адбылося...

У свой час касцёл наведаў Адам Мальдзіс, і на яго пытанне, ці з'яўляе абраз цуды ў Кракаве, айцы-езуіты адказалі адмоўна. Не з'яўляе цудаў і копія абраза, што знаходзіцца ў Юравічах. То можа настала пара, каб абмяняць копію абраза на арыгінал? Вёска Юравічы — на тэрыторыі забруджанага радыяцыяй Калінкавіцкага райна, у непасрэднай блізкасці ад найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы Хойніцкага, Брагінскага, Нараўлянскага раёнаў. І ўсё ж можна спадзявацца, што вяртанне святыні ў Юравічы будзе своечасовым. Магчыма, як і даўней, цудатворны абраз Святой Маці Божай Юравіцкай пачнуць наведваць паломнікі-пілігрымы. А каб вярнулася наша святыня, патрэбна добрая супольная воля вернікаў Польшчы і Беларусі.

На другі дзень вандроўкі ў нас была экскурсія ў горад Вялічка, дзе знаходзяцца славутыя саляныя копі. Радовішча каменнай солі распрацоўвалася яшчэ з XIII стагоддзя. Больш за паўвека соль у шахтах не здабываецца, і былыя копі — аб'ект турызму: штогод іх наведвае каля мільёна турыстаў. З 1978 года шахта — у Спісе аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. На глыбіні 120 метраў ёсць рэстаран, дзе можна смачна паабедаць, а на глыбіні 101 метр турысты знаёмяцца з дзеючай каталіцкай капліцай, даўжыня залы якой 54 метры, шырыня — 18 і вышыня 10-12. Глыбіня распрацовак дасягае 327 метраў але турыстаў знаёмяць толькі з тым, што на глыбіні да 130 метраў. Мы бачылі статуі з солі Мікалая Каперніка, Іагана Гётэ, Папы Рымскага Іаана Паўла II. Ёсць там і шматлікія каплічкі з абразамі, каля якіх маліліся шахцёры-солездабытчыкі.

Падарожжа ў старажытны Кракаў, у гісторыю якога ўпісалі цікавыя старонкі і нашы знакамітыя супляменнікі, пакінула незабыўныя ўражанні на ўсё маё жыццё.

Лявон Целеш,
г. Дзяржынск

Даведка ГР

У зімовы семестр 1504 года Францішак Скарына паступіў на навучанне ў Кракаўскую акадэмію на факультэт вольных мастацтваў або філасофіі. Заснаваная яшчэ ў 1364 годзе Казімірам Вялікім, акадэмія славілася як адзін з асноўных цэнтраў еўрапейскай астраноміі і астралогіі, матэматыкі, праўных і гуманітарных навук. У 1400 годзе кароль Ягайла абнавіў і значна пашырыў установу, якая атрымала сваю другую назву — Ягелонскі ўніверсітэт. За 77 гадоў (1433—1510) у яго запісалася больш за 17 тысячаў абітурыентаў, больш за 8 тысячаў з якіх былі іншаземцамі.

Няма сумнення, што ў Кракаве Францішак Скарына ўсвядоміў навучальныя і асветніцкія магчымасці друкаванай кнігі.

У 1504-1505 гадах, калі Францішак быў студэнтам, ва ўнівэрсітэт паступіў 291 чалавек, з іх 141 — ураджэнцы Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, а 150 — з-за мяжы. З іх вучоную ступень атрымалі 60 юнакоў, сярод іх — і Скарына. Праз 2 гады, у 1506 годзе, ён вытрымаў экзамэн на ступень бакалаўра вольных мастацтваў. У прамацыйнай кнізе ўнівэрсітэта захаваўся наступны запіс: "У год Пана 1506, падчас дэканства Леанарда з Добшыц, бакаляўра кананічнага права… У тым жа годзе, у бліжэйшы дзень пасля свята Св. Люцыі, на якое прыпадае сухаядзенне, асобы, узведзеныя ў ступень бакаляўра, былі размеркаваныя ў наступным парадку месцаў: Мацвей з Семнійклоп, Андрэй з Зынты, Яган з Гараў, Тамаш з Падляшша, Францішак з Полацку, ліцьвін..." Гэта адбылося 14 снежня 1506 года.

СТАРОНКА ПАМЯЦІ

Максім Танк. Паштоўка, адрасаваная на Кубу

Перабіраючы старыя лісты, натыкнуўся на канверт з адрасам: "Масква п/с 293 — "А" А. М. Карлюкевіч…" А зваротны адрас — Мінск, вул. Кульман, 15 — 118, М. Танк". Дробны почырк. У канверце — паштоўка. Маскоўскі адрас на самай справе — Куба, вайсковае злучэнне з дыслакацыяй паблізу Гаваны. Туды я патрапіў на службу адказным сакратаром шматтыражнай газеты "Информационный бюллетень".

Максім Танк

Алесь Карлюкевіч

А з народным паэтам Беларусі Максімам Танкам зрэдзьчасу ліставаўся і раней. Меў яшчэ са школьных гадоў яго кнігу з аўтографам — "Дарога, закалыханая жытам". Зараз зборнік гэты, якім мяне ўзнагародзілі за ўдзел ці перамогу ў адным з конкурсаў радыёклуба "Жывое слова", перададзены ў Брэсцкую абласную бібліятэку імя Максіма Горкага, як і яшчэ добрая тысяча кніг з маёй хатняй бібліятэкі.

Чытаю даўнюю навагоднюю паштоўку:

"Мінск. 9. 01. 90 г.

Дарагі дружа!

Дзякую за памяць і навагоднія пажаданні. Ад усяго сэрца віншую і Вас з Новым годам. Хай будзе ён для ўсіх нас радасным і шчаслівым, мірным і шчодрым на добрыя справы і здзяйсненні ўсіх нашых найлепшых спадзяванняў.

На вялікі жаль, пра сустрэчу з кубінскім паэтам нічога вартага ўвагі не магу прыгадаць, бо гэта было так даўно. Ды і сам зараз кепска чуюся са здароўем, каб шукаць нейкіх слядоў гэтай сустрэчы ў архівах. Не крыўдуйце на ветэрана.

Максім Танк".

Пэўна, я распытваў пра іх сустрэчу з Нікаласам Гільенам… На жаль, нітачку памяці звязаць не ўдалося. Але ўсё адно я ўдзячны Максіму Танку і за гэтую паштоўку. Яна была тады для мяне як глыток паветра, а значыць — як глыток роднай беларускай мовы.

А што да повязяў беларускіх пісьменнікаў з Кубай, да сустрэч нашых паэтаў і празаікаў, то пра гэта ў розныя гады мне шмат расказвалі і Рыгор Барадулін, і Карлас Шэрман, і Алесь Жук...

Дарэчы

Нікалас Гільен — кубінскі паэт, лаўрэат Сталінскай прэміі "За ўмацаванне міру паміж народамі" (1954), Міжнароднай прэміі імя Хрыста Бацёва.

Гільен пры жыцці стаў нацыянальным паэтам Кубы. На беларускую мову яго перакладалі Рыгор Барадулін, Міхась Стральцоў. Музыку на яго вершы пісаў кампазітар Сяргей Картэс.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Блізка як ніколі раней

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Сёлета на востраве з канцэртамі пабывалі спявачка Жанна Версо і ансамбль "Рапсодыя" з Брэсцкай абласной філармоніі. А мастак з Гомеля Юры Пташынскі прывозіў выставу "Шоу пясчаных карцін". У чэрвені на Сардзініі выступіў ансамбль танца "Равеснік". У XXI Міжнародным фальклорным фестывалі "Су Масу" ў горадзе Эльмас паўдзельнічаў у канцы ліпеня – пачатку жніўня народны вакальна-харэаграфічны гурт "Сеніца" з Мінскага раёна. Беларускі ансамбль народнага танца "Чабарок" выступіў на Міжнародным фольк-фэсце ў сардзінскім горадзе Іглесіас.

І надалей запланавана шмат розных імпрэз: у верасні пройдуць "Дні беларускай кухні на Сардзініі", у кастрычніку — сустрэчы з пісьменнікамі ды кінематаграфістамі з Беларусі, у лістападзе на Міжнародны фестываль харавых спеваў духоўнай музыкі "Каледж Каларытанум" запрошаны адзін з беларускіх хораў.

Хоць і падаецца, што Беларусь і Сардзінія далёка адно ад другога, але ўжо шмат што нас лучыць.

Фольк-гурт "Вурай" выступаў у Кальяры і Сасары на Сардзініі

Сёлета ж, у Год беларускай культуры, можна ўвогуле адчуць сябе на італьянскім востраве як дома, з галавой акунуцца ў плынь роднай культуры.

Дарэчы, у сезон адпачынкаў усё часцей сустракаюцца на Сардзініі беларускія турысты. Спрыяюць таму і нядаўна заключаныя дамовы паміж тураператарамі Сардзініі ды авіякампаніяй "Белавія". Цяпер на востраў можна трапіць рэйсамі праз Рым з начлегам і экскурсіямі, альбо з прыпынкам у сталіцы моды Мілане. А тым, хто марыць найхутчэй апынуцца на пляжах, ля ласкавага мора, можна перасесці ў рымскім аэрапорце на адзін з шматлікіх рэйсаў да Сардзініі.

ВЕСТКІ

Квітней, фестываль!

Новую гарадскую скульптуру "Дружба народаў" адкрылі ў Глыбокім на "Вішнёвым фестывалі"

На памяць пра сёлетні "Вішнёвы фестываль", што ўжо ў пяты раз прайшоў у горадзе Глыбокім Віцебскай вобласці, з'явіўся новы арт-аб'ект. Дэкаратыўна-мастацкая кампазіцыя з металу "Дружба народаў" змясцілася на цэнтральнай плошчы горада. Увасоблена ў ёй галоўная ідэя свята — аб'яднанне людзей. Сапраўды, з кожным годам на фэсце — усё больш удзельнікаў. Гэтым разам былі госці з Германіі, Грузіі, Ізраіля, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Францыі, прадстаўнікі рэгіёнаў Беларусі, а таксама творчыя калектывы, якія распавядаюць пра культуру розных народаў свету.

Гасцей і ўдзельнікаў свята вітала гаспадыня фестывалю — Вішнёвая Каралева, якая ўзначаліла ўрачыстае шэсце па цэнтральнай вуліцы Глыбокага і праводзіла на галоўную плошчу горада, дзе й прайшло адкрыццё новага арт-аб'екта. Пад час фестывалю ўдзельнікі заклалі таксама дуброву. Дарэчы, дуб лічыцца дрэвам-доўгажыхаром. Таму, спадзяюцца арганізатары, і "Вішнёвы фестываль" будзе жыць доўга, дуброва прырастаць новымі дрэвамі, а свята — новымі сябрамі.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Далёкі родны брат

Пра тое, што ў Якуба Коласа за акіянам жыве родны брат Міхась Міцкевіч, раней не пісалі ні ў школьных падручніках, ні ў савецкіх СМІ

Іван Ждановіч

Сямейную таямніцу Коласаўскага роду прыадкрыла мне на пачатку 90-х гадоў, здаецца, Вера Міцкевіч — унучка Якуба Коласа, дачка ягонага сына Данілы. Часопіс "Роднае слова", у якім я тады працаваў, да чарговага юбілею Песняра публікаваў шэраг цікавых матэрыялаў: каб іх маглі выкарыстаць настаўнікі на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Мы з тагачасным рэдактарам Міхасём Шавыркіным прыдумалі рубрыку "Дзе льецца Нёман срэбраводны", акрэслілі вялікі план тэматычных публікацый на год. Тады ж пры дапамозе супрацоўнікаў Коласаўскага музея, падтрымцы ягонай дырэктаркі Зінаіды Камароўскай шмат удалося зрабіць. І Вера Данілаўна, тады супрацоўніца музея, была ў праекце. У прыватнасці, была зроблена частка радаводу Канстанціна Міцкевіча. Па ёй бачна, што не ўсе дзеці ў вялікай сям'і, дзе нарадзіўся будучы Пясняр, выжылі — некаторыя памерлі малымі. Быў пазначаны ў радаводзе і Коласаў малодшы брат Міхась, які жыў у Злучаных Штатах Амерыкі.

Пра тое згадалася, калі з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, што месціцца ў Мінску па вул. Кірылы і Мяфодзія, 4, прыйшоў прэс-рэліз: ладзіцца Літаратурны вечар да 120-годдзя з дня нараджэння малодшага брата Якуба Коласа Міхася Міцкевіча (Антося Галіны). Да справы далучыўся і Дзіцячы фонд духоўнага і культурнага адраджэння "САКАВІК", у якім актыўна працуе Марыя Міцкевіч, яшчэ адна з унучак Якуба Коласа. Дарэчы, Марыя Міхайлаўна і была ініцыятаркай вечарыны, пра што сказала мне, калі 14 ліпеня ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрывалася выстава "Зора і Вітаўт", прымеркаваная да 90-х угодкаў беларускіх дзеячаў у ЗША Зоры і Вітаўта Кіпеляў.

Міхась Міцкевіч услед за вядомым братам узяў сабе літаратурны псеўданім: Антось Галіна. Ён, як і Якуб Колас, быў пісьменнікам, перакладчыкам, педагогам і грамадскім дзеячам. Ён адзіны з чатырох братоў класіка па ягоным жа шляху паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. "Мой Міхаіл", "мой брат, таксама настаўнік", — такія радкі ёсць у лістах Якуба Коласа: ён сачыў за выхаваннем і адукацыяй малодшага брата, выпісваў для яго газету "Наша ніва", дапамагаў кніжкамі, падручнікамі.

Міхась Міцкевіч з дзецьмі Юрыя Прускага, г. Дэтройт, 1968 г.

Яшчэ ў семінарыі Міхась далучыўся да літаратурнай творчасці, падпісваўся: Міхась Мяцёлка, М.М-ч. Гэта былі публіцыстычныя артыкулы пра ролю настаўнікаў, інтэлігенцыі ў нацыянальным адраджэнні, пра беларускую мову і культуру, пра жыццё сялян, настаўнікаў, семінарыстаў. Свае ж аповесці, апавяданні Міхась часцей падпісваў: Антось Галіна. Бачачы два кірункі творчасці Міхася Міцкевіча, Максім Гарэцкі адзначаў: ён "вельмі спадзейны малады бэлетрыст і паважаны публіцыст". Творы Міхася Міцкевіча друкаваліся ў выданнях "Вольная Беларусь", "Звон", "Беларусь" ды іншых.

Ён добра ведаў тое, пра што пісаў, бо пісанне спалучаў з працай настаўніка Мінскай Беларускай Гімназіі, а потым і з працай на полі ў родных мясцінах: на Стаўпеччыне. Падзел Беларусі на Заходнюю (увайшла ў склад Польшчы) і Усходнюю ў 1921-м надоўга разлучыў братоў. У 1939 годзе, калі Заходняя Беларусь была далучана да БССР, вясковец зноў пайшоў у народную асвету. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, школьным інспектарам.

У 1950 годзе Міхась Міцкевіч пераехаў у ЗША. Быў намеснікам старшыні Галоўнай управы Беларуска-Амерыканскага задзіночання, старшынёй выдавецкага фонду "Беларус", некаторы час — рэдактарам газеты "Беларус". Якубу Коласу Міхась прысвяціў некалькі артыкулаў, якія друкаваліся ў эміграцыйных выданнях, найбольш грунтоўны — "Кароткі ўспамін" у часопісе "Беларускі Сьвет". Шмат гадоў Міхась Міцкевіч выдаваў часопіс "Голас Царквы", быў апекуном Сабора Святога Кірылы Тураўскага ў Ню-Ёрку. Падрыхтаваў беларускі царкоўны каляндар, пераклаў на беларускую мову Напрастольнае і Паспалітае Евангелле, іншыя богаслужбовыя тэксты. "Дзядзька Міхась быў чалавекам добрым, самаўпэўненым і веруючым, — пісаў вядомы дзеяч беларускай эміграцыі Мікола Прускі. — Гэта быў дабрадушны й цудоўны чалавек, вялікі патрыёт, і любіў ён сваю Бацькаўшчыну як нешта святое".

Спецыяльна да юбілею Міхася Міцкевіча падрыхтавана невялічкая выстава з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, з прыватнага архіва нашчадкаў Якуба Коласа. Экспануюцца лісты юбіляра, беларускія і эміграцыйныя выданні, рукапісныя творы Міхася Міцкевіча, пераклады рэлігійных тэкстаў ды іншыя. Дарэчы, як патлумачыла супрацоўніца музея Наталля Гардзіенка, здымкаў юбіляра ў ягоных фондах вельмі мала. На нашу просьбу даслала тры — фактычна толькі яны і ёсць. На адным з іх, зробленым у Дэтройце ў 1968 годзе, мы бачым Міхася Міцкевіча, якому ўжо за 70, з дзецьмі Юрыя Прускага.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 287 16 91
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 287 15 32; факс: +375 17 287 15 26
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1920, Заказ: 1074
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2017